# СЕКЦИЯ 1.
# АКТУАЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ
# ЦЕРКОВНО-ИСТОРИЧЕСКИХ ИССЛЕДОВАНИЙ

## ПРОТАІЕРЭЙ ІААН ГРЫГАРОВІЧ (1792–1852 ГГ.) – ЗБІРАЛЬНІК ПІСЬМОВАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСАЎ

*Протыдыякан Віталій Дубяга, кандыдат багаслоўя*
*(Мінск, Свята-Духаў кафедральны собор)*

Цікаўнасць да айчыннай гісторыі, якая ўзмацнілася пасля распаду СССР, прывяла да персаніфікацыі гісторыі. Беларуская гістарычная навука, развіваючыся ў рамках агульнасусветных тэндэнцый, дэманструе значную ўвагу да вывучэння ролі асобы ў гісторыі. Гісторыкі актыўна далучыліся да працэсу вывучэння персаналій, якія раней па розных прычынах былі незаслужана «забытыя», але зрабілі значны ўклад у гістарычнае мінулае Беларусі і ў цэлым усходнеславянскіх народаў. Адным з такіх дзеячаў з'яўляецца протаіерэй Іаан Грыгаровіч (1792–1852 гг.) [20].

Яго навуковая праца шмат у чым паслужыла станаўленню айчыннай археаграфіі, а царкоўная дзейнасць стала добрым прыкладам пастырства. Аднак маштабамі сваёй асобы: пастыр, археограф, педагог, філолаг, – ён выйшаў далёка за геаграфічныя межы Беларусі [21].

Як пастыр, айцец Іаан Грыгаровіч павінен быў несці святло Хрыстова свету, што ён і рабіў з любоўю да людзей спачатку ў Гомелі і Віцебску, а з 1830 г. і да канца жыцця ў Санкт-Пецярбургу. Ён заўсёды клапаціўся аб

добраўпарадкаванні храмаў, у якіх служыў. Захаваліся пропаведзі і дагматычнае сачыненне Грыгаровіча [18].

Як археограф ён фактычна быў першым, хто сістэматычна пачаў збіраць і выдаваць старажытныя рукапісы, акты, каштоўныя гістарычныя матэрыялы [1–8]. Пры гэтым ён карыстаўся напрацоўкамі свайго родзіча Праасвяшчэннага Георгія /Каніскага/, архіепіскапа Беларускага [15, 16, 24]. Зараз з усёй упэўненасцю можна сказаць, што вялізная колькасць археаграфічных дакументаў, якія з'яўляюцца матэрыялам для даследу сучасных, як свецкіх, так і царкоўных гісторыкаў, без навуковай і выдавецкай дзейнасці протаіерэя Іаана Грыгаровіча да нашых дзён не захавалася б. Гэтым ён зрабіў сваім нашчадкам неацэнную паслугу.

Як педагог айцец Іаан, з'яўляючыся выкладчыкам Магілёўскага павятовага вучылішча, рэктарам Гомельскіх і Віцебскіх павятовых і прыходскіх вучылішчаў, клапаціўся і дбаў не толькі аб адукацыі вучняў, але, галоўнае, і аб іх духоўна-маральным, хрысціянскім выхаванні. Задачы адукацыі ён разумеў, перадусім, у аднаўленні вобраза Божага ў чалавеку. Разам з тым, ён адрозніваўся наватарствам, што выяўлялася ў змене пэўных схем выкладання.

Як філолаг, які вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі [22] і Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі, протаіерэй Іаан Грыгаровіч валодаў шматлікімі замежнымі мовамі, што, без сумнення, спрыяла яго археаграфічнай дзейнасці. Сярод прац, напісаных Грыгаровічам, варта вылучыць «Слоўнік заходнерускай гаворкі».

Яго цікаўнасць да гістарычных дакументаў, створаных на тэрыторыі Беларусі, выявілася ў з'яўленні шматлікіх зборнікаў і гістарычных прац, дзякуючы якім мы і зараз можам звяр-

тацца да жыцця нашых продкаў, выбіраючы з яго для нашага часу ўсё самае лепшае і неабходнае. У нейкім сэнсе яго навуковая праца з'яўляецца звяном, якое злучае мінуўшчыну і сучаснасць. Разам з тым, прыемна ўсведамляць, што такая разнастайная дзейнасць удалася верніку, узорнаму пастыру Праваслаўнай Царквы, які годна пранёс свой жыццёвы крыж і паказаў прыклад маральнага ладу жыцця і працалюбства для многіх і многіх сваіх паслядоўнікаў.

У сваіх археаграфічных працах айцец Іаан Грыгаровіч удзяляў значны час пытанням, якія так ці інакш маюць дачыненне да гісторыі Царквы. Напрыклад, з больш за 1900 выданых пад яго рэдакцыяй дакументальных актаў 717 (37,8%) непасрэдна звязаны з царкоўнай тэматыкай.

На думку М.О. Каяловіча, працы Грыгаровіча адкрылі «цалкам новы радок грамадзянскага і рэлігійнага жыцця» Заходняга краю [18, с. 331].

Жыццё протаіерэя Іаана Грыгаровіча можна падзяліць на восем перыядаў.

Для першага перыяду (1792–1801 гг.) характэрны ўплыў сям'і – патомных святароў, сярод якіх былі архіепіскап Георгій /Каніскі/ і протаіерэй Іаан Кононавіч Грыгаровіч. Ужо з маленства светапогляд Іаана фарміраваўся на рэлігійнай аснове.

Другі перыяд (1801–1811 гг.) звязаны з навучаннем у Магілёўскай духоўнай семінарыі, дзе пачалі выяўляцца першыя схільнасці да археаграфічнай працы [22].

Трэці перыяд (1811–1815 гг.) – перыяд педагагічнай працы ў Магілёўскім павятовым вучылішчы, спалучаны з адміністратыўнай працай на пасадзе інспектара. У гэты час у Грыгаровіча сфарміравалася пачуццё адказнасці за людзей, на лёс якіх ён меў уплыў.

Чацвёрты перыяд (1815–1819 гг.) – вучоба ў Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі і пачатак археаграфічнай дзейнасці ў «румянцаўскім гуртку». Вельмі важна адзначыць станоўчы ўплыў у гэты час М.П. Румянцава на фарміраванне інтарэса ў Іаана Грыгаровіча да заняткаў айчыннай археаграфіяй.

Пяты перыяд (1820–1829 гг.) звязаны з пачаткам пастырскай дзейнасці ў Гомелі, рэктарствам у прыходскім і епархіяльным вучылішчах і выданнем пры падтрымцы канцлера М.П. Румянцава першых гістарычных прац, сярод якіх «Даследаванне пра пасаднікаў наўгародскіх» (1821) [13]; «Беларускі архіў старажытных грамат. Частка I» (1824) [12]; «Беларуская іерархія» (1824) (была надрукавана пад рэдакцыяй М. Нікалаева толькі ў 1992 г.) [17, 23]. Пераломным момантам у навуковай працы айца Іаана стала смерць М.П. Румянцава, у выніку якой амаль на 6 гадоў спынілася выданне прац пастыра-археографа.

Шосты перыяд (1829–1830 гг.) вызначаецца плённай дзейнасцю на пасадзе рэктара ў Віцебскіх прыходскім і епархіяльным вучылішчах, благачыннага, прысутнага духоўнага праўлення, цэнзара пропаведзяў і настаўніка Закону Божага ў губернскай гімназіі.

Сёмы перыяд (1830–1837 гг.) – служэнне ў царкве свяціцеля Спірыдона Трымiфунцкага Лейб-гвардыі Фінляндскага палка. Адчуваючы падтрымку палкавога начальства, Грыгаровіч здолеў выдаць «Гістарычныя звесткі аб жыцці свяціцеля Мітрафана, першага варонежскага епіскапа» (1832) [10]; «Паведамленне пра старажытны храм Хрыста Спасіцеля, пабудаваны ў XII стагоддзі прападобнай Еўфрасініяй, ля Полацка» (1832); «Перапіску пап з расійскімі гасударамі ў XVI стагоддзі» (1834) [14, 9]; «Збор

твораў Праасвяшчэннага Георгія (Каніскага), з нарысам яго жыцця» (1835) [15, 9], а таксама шэраг іншых прац. Акрамя гэтага, у перыяд з 1834 па 1837 гады айцец Іаан цалкам бясплатна выкладаў Закон Божы і рускую граматыку ў прытулку для бедных.

Восьмы перыяд жыцця і дзейнасці протаіерэя Іаана Грыгаровіча (1837–1852 гг.) звязаны з актыўнай археаграфічнай дзейнасцю ў Санкт-Пецярбургскай археаграфічнай камісіі спачатку ў якасці шараговага супрацоўніка, а потым галоўнага рэдактара дзяржаўна-юрыдычных актаў. Для палягчэння працы на новай пасадзе ён быў пераведзены ў царкву святога благавернага князя Аляксандра Неўскага пры Анічкавым палацы [11]. За 15 гадоў працы ў камісіі Грыгаровіч здолеў сабраць матэрыял і выдаць І, ІІ і IV тамы «Актаў гістарычных» (1841–1842) [1–3], І–IV і часткова V тамы «Актаў, што належаць да гісторыі Заходняй Расіі» (1846–1853) [4-8].

Працуючы над сабранымі матэрыяламі, Грыгаровіч атрымліваў кансультацыі такіх вядомых прафесараў як І.Н. Лабойка, А.Х. Вастокаў, сябара «румянцаўскага гуртка» К.Ф. Калайдовіча, мітрапаліта Яўгенія /Балхавіцінава/ і іншых спецыялістаў. Археаграфічная праца патрабавала цеснага навуковага кантакту з многімі вучонымі.

Уведзены даследчыкамі ў XIX ст. ў навуковы абарот матэрыял выклікае неабходнасць не толькі адрадзіць у гістарычнай памяці беларусаў вялізную колькасць несправядліва забытых імёнаў, але і нанова глянуць на грамадскую значнасць іх дзейнасці.

На мой погляд, надышоў час комплексна і сістэмна звярнуць увагу на падыход да вывучэння гісторыі Беларусі. У тым ліку і ў Духоўных школах Беларускай Праваслаўнай Царквы.

Мы павінны глядзець на гістарычныя працэсы, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі, ролю гісторыкаў, якія прымалі ў іх удзел, не з пункту гледжання ідэалагічных поглядаў суседніх дзяржаў, а праз прызму самабытнай культуры і ментальнай адметнасці беларусаў. Толькі праўдзівая, усёабдымная праца па адраджэнню тысячагадовай гістарычнай спадчыны нашага народа здольная астудзіць многія гарачыя галовы, якія ставяць пад сумнеў нацыянальную ідэнтычнасць, культуру і мову беларусаў. Такое стаўленне сустракаецца ў нашы дні, такое было і ў XIX ст.

Вось адзін паказальны прыклад, апісаны сынам Грыгаровіча Мікалаем у «Нарысе жыцця протаіерэя Іаана Грыгаровіча», выданым у красавіцкім нумары часопіса «Вандроўнік» у 1861 г.

Калі айцец Іаан служыў у Віцебску, праз горад праязджаў імператар Мікалай I у суправаджэнні свайго духаўніка протапрасвітара Мікалая Васільевіча Музоўскага. Апошні захварэў і спыніўся на лячэнне ў айца Іаана. Даведаўшыся пра навуковыя здольнасці віцебскага святара, протапрасвітар запрасіў айца Іаана служыць у сталіцу, пагардліва назваўшы Віцебск «небывалым глухім кутом» [18, с. 328]. Гэта ён так назваў горад, на той час ужо з больш за 800-гадовай гісторыяй, які ўжо 58 гадоў знаходзіўся ў складзе Расійскай імперыі! Магчыма, гэта выключэнне. Але гэта было.

Протаіерэй Іаан Грыгаровіч займаўся археаграфічнай працай падчас актыўнага развіцця культуры, мовы беларусаў, адраджэння пасля перыяду уніі роднай для беларусаў праваслаўнай веры. Яго намаганнямі знойдзена і выдадзена шмат дакументаў часоў Вялікага Княства

Літоўскага, Рэчы Паспалітай.

Больш падрабязней аб дзейнасці протаіерэя Іаана Грыгаровіча можна даведацца з кандыдацкай дысертацыі, якая была абаронена ў Мінскай духоўнай семінарыі ў 2008 г. [19].

Надышоў час і на гэты перыяд нашай гісторыі зірнуць з пункту гледжання беларускай, то бок нашай з вамі, дзяржаўнасці, якая, як вядома, даецца народам Богам, і, нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія сустракаюцца ў нашым жыцці, з'яўляецца залогам развіцця Беларускай Праваслаўнай Царквы.

Вывучэнне дзейнасці такіх гісторыкаў Царквы, як протаіерэй Іаан Грыгаровіч, дапаможа беларускай дзяржаве больш поўна асэнсаваць уплыў праваслаўнай адукацыі і духавенства на гісторыю і фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці.

Далейшая распрацоўка асноўных напрамкаў супрацоўніцтва паміж дзяржавай і Царквой будзе мець перашкоды без адзінай ацэнкі працы праваслаўных гісторыкаў, пастыраў і педагогаў, сярод якіх протаіерэй Іаан Грыгаровіч, П. Жуковіч, К. Харламповіч, С. Рункевіч і іншыя.

Усебаковае вывучэнне дзейнасці праваслаўных гісторыкаў беларускай зямлі, іх уплыву на станаўленне самасвядомасці беларусаў, можа дапамагчы дзяржаўным органам пазбегнуць многіх памылак і недаглядаў у каардынацыі задач духоўнай і свецкай адукацыі, станаўлення беларускай ідэалогіі.

## КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

1. Акты исторические, собранные и изданные археографической комиссией : в 5 т. / Главный редактор – протоиерей Иоанн Григорович и др. – Санкт-Петербург : В типографии экспедиции заготовления государственных бумаг, 1841. – Т. 1. – 551 с. прим. – 44 с.

2. Акты исторические, собранные и изданные археографической комиссией : в 5 т. / Главный редактор – протоиерей Иоанн Григорович и др. – Санкт-Петербург : В типографии II-го отделения Собственной Его Императорского Величества Канцелярии, 1841. – Т. 2. – 438 с. прим. – 29 с.

3. Акты исторические, собранные и изданные археографической комиссией : в 5 т. / Главный редактор – протоиерей Иоанн Григорович и др. – Санкт-Петербург : В типографии II-го отделения Собственного Его Императорского Величества Канцелярии, 1842. – Т. IV. – 565 с. прим. – 24 с.

4. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией: в 5 т. / Главный редактор – протоиерей Иоанн Григорович. – Санкт-Петербург : В типографии II-го отделения Собственной Его Императорского Величества канцелярии, 1846. – Т. 1. – 375 с.: прил. – 15 с.

5. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией: в 5 т. / Главный редактор – протоиерей Иоанн Григорович. – Санкт-Петербург : В типографии II-го отделения Собственной Его Императорского Величества канцелярии, 1848 – Т. II. – 405 с.: прил. – 14 с.

6. Акты, относящихся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией:

в 5 т. / Главный редактор – протоиерей Иоанн Григорович. – Санкт-Петербург : В типографии II-го отделения Собственной Его Императорского Величества канцелярии, 1848. – Т. III. – 356 с.

7. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и издаваемые археографической комиссией: в 5 т. / Главный редактор – протоиерей Иоанн Григорович. – Санкт-Петербург : В типографии II-го отделения Собственной Его Императорского Величества канцелярии, 1851. – Т. IV. – 583 с.

8. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и издаваемые археографической комиссией: в 5 т. / Главный редактор – протоиерей Иоанн Григорович. – Санкт-Петербург : В типографии II-го отделения Собственной Его Императорского Величества канцелярии. 1853, – Т. V. – 324 с.

9. Белорусский государственный архив-музей литературы и искусства (БГАМЛИ). Фонд 6. – Оп. 1. – Ед. хр. 1. Письмо и рапорт протоиерея И.И. Григоровича полковому командиру об изданных им книжках «Собрание сочинений архиепископа Георгия /Конисского/» и «Переписка пап с российскими государями в XVI веке». Черновик. С сопроводительным письмом Офросимова А.Ф. Арбузову.

10. БГАМЛИ. Фонд 6. – Оп. 1. – Ед. хр. 35. Объявления об издании и продаже книг религиозного содержания, в том числе сочинения протоиерея Иоанна Григоровича «Житие святого Митрофана, первого епископа Воронежского». Печатные. 1832 год.

11. БГАМЛИ. Фонд 6. – Оп. 1. – Ед. хр. 2. «Формулярный список о священно-церковнослужителях, с их семейства-

ми, церкви Собственного Его Императорского Величества Дворца за 1850-й год».

12. Григорович И.И., протоиерей. Белорусский архив древних грамот. – Москва : Тип. С. Селивановского, 1824. – Ч. I. – 148 с., 16 с. предисловие.

13. Григорович Иоанн, протоиерей. Исторический и хронологический опыт о посадниках новгородских. Из древних русских летописей / протоиерей Иоанн Григорович. – Москва : Тип. С. Селивановского, 1821. – 310 с.

14. Григорович Иоанн, протоиерей. Переписка пап с российскими государями в XVI веке, найденная между рукописями, в римской Барбериниевой библиотеке / протоиерей Иоанн Григорович. – Санкт-Петербург : Типография при Императорской Академии наук, 1834. – 116 с.

15. Григорович Иоанн, протоиерей. Собрание сочинений Георгия Конисского, архиепископа белорусского / протоиерей Иоанн Григорович. – Санкт-Петербург : Типография Императорской Академии наук, 1835. – Ч. 1. – LXVI с., 295 с.

16. Григорович Иоанн, протоиерей. Собрание сочинений Георгия Конисского, архиепископа Белорусского / протоиерей Иоанн Григорович.– 2-е изд. доп. – СПб.:Типография Э. Веймара, 1861. – Ч. 2. – 276 с.

17. Грыгаровіч І. І., протаіерэй. Беларуская іерархія / протаіерэй І. І. Грыгаровіч / Пад рэдакцыяй М. Нікалаева, – Мінск : БелЭн, 1992. – 102 с.

18. Григорович, Н.И. Очерк жизни протоиерея Иоанна Иоанновича Григоровича / Н.И. Григорович // Странник. – 1861. – Апрель. – С. 303–338.

19. Дубяга Виталий, диакон. Жизнь и деятельность протоиерея Иоанна Григоровича (1792–1852 гг.) : дисс. … канд.

богосл. / диакон Виталий Дубяга. – Жировичи : Минская духовная академия, 2008. – 207 с.

20. Дубяга Виталий, диакон. Протоиерей Иоанн Кононович Григорович и его ученая семья / диакон Виталий Дубяга // Минские епархиальные ведомости. – 2007. – №4. – С. 65–67.

21. Іванова, В. Дакументальная спадчына протаіерэя Іаана Грыгаровіча / Вольга Іванова // Праваслаўе. – 2004. – № 12–13. – С. 78–85.

22. Российский государственный исторический архив. Фонд 796. – Оп. 89. – Д. 419. Ведомость об учителях и учениках Могилевской семинарии за 1806 г.

23. Отдел рукописей Российской национальной библиотеки (ОР РНБ). Фонд 1000. – Оп. 2. – Д. 358. Протоиерей Иоанн Иоаннович Григорович. Рукопись «Белорусской иерархии». Переписана неустановленным лицом.

24. ОР БАН РБ. Фонд 23. – Оп. 1. – Ед. хр. 1161. Шестьдесят две проповеди архиепископа Георгия (Конисского), архиепископа Белорусского.